А.У.Марозаў,
*доктар філалагічных навук*

# ПАРАЎНАЛЬНЫ АНАЛІЗ СУТНАСНЫХ ХАРАКТАРЫСТЫК ЛУБКА І ПРЫПЕЎКІ
## (гістарыяграфія з'яў культуры ўсходніх славян)

Без уяўлення сутнасных характарыстык лубка і прыпеўкі немагчыма ў поўнай меры прасачыць іх гісторыю, выявіць ідэйна-тэматычнае багацце, вызначыць перспектывы далейшага выкарыстання гэтых своеасаблівых з'яў у духоўнай культуры ўсходніх славян.

Праведзены намі аналіз гістарыяграфічнага матэрыялу, назапашанага за больш чым стогадовы перыяд вывучэння, сведчыць аб тым, што фармальныя і змястоўныя характарыстыкі лубка і прыпеўкі выклікалі пастаянныя навуковыя спрэчкі.

Адзінае, у чым зыходзяцца погляды дарэвалюцыйных даследчыкаў, — гэта ў тым, што агульнадаступныя па форме і змесце народны лубок і «новая песня» пераўтвараюцца ў масавую з'яву. Ацэнкі лубачных малюнкаў і прыпевак як твораў мастацтва былі самымі рознымі: ад ухвалення даступнасці іх формы і зместу да рэзкага асуджэння і заклікаў да барацьбы са спрашчэннямі ў народнай творчасці.

На нашу думку, дыяметральна процілеглыя погляды на ролю масавых з'яў народнай культуры былі выкліканы нераспрацаванасцю аб'ектыўных крытэрыяў традыцыйнасці. Акрамя таго, у дакастрычніцкі час недастаткова вырашаліся задачы даследавання формы, паэтычнай і асабліва музычнай, а таксама ідэйна-тэматычнага зместу прыпеўкі. Вядомы толькі асобныя працы, якія прысвечаны агляду некаторых прыпевачных матываў (Сімакоў В.І. Жыццё сялянскай дзяўчыны па народных прыпеўках, 1911; Чыж В.Ф. Псіхалогія сялянскай прыпеўкі, 1915).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адметнай асаблівасцю даследаванняў савецкага часу з'яўляецца аналіз формы і ідэйна-тэматычнага зместу прыпеўкі з пункту гледжання праяўленняў грамадскіх функцый гэтага жанру. Так, у артыкуле «Паходжанне прыпеўкі» (1925) А.М.Смірноў-Кутачэўскі, хаця і знаходзіць у прыпеўцы нешта агульнае са скамарохавымі песнямі, тым не менш бачыць у іх паэтыцы і змесце адлюстраванне ўмоў і патрабаванняў гарадской фабрычнай вытворчасці. Б.Л.Разенфельд, наадварот, настойвае на сялянскім паходжанні жанру і лічыць, што «прыпеўка па сваёй форме не новая. Зачаткі гэтага жанру ў больш ці менш аформленым, хаця, верагодна, не адасобленым выглядзе, існавалі ў старым фальклоры» («Да пытання пра паходжанне і фарміраванне жанру сучаснай прыпеўкі», 1929). П.І.Калецкі прапануе тэорыю пра эвалюцыю паэтыкі прыпеўкі, аднак тэорыя не падмацавана належнай доказнай базай і спрошчана тлумачыцца «новымі ідэалагічнымі задачамі» гэтага жанру («Пра паэтыку прыпеўкі», 1936).

А.А.Фёдараў-Давыдаў у рабоце «Да пытання пра сацыялагічнае вывучэнне старарускага лубка» (1927) паказвае, як у традыцыйным выяўленчым мастацтве назапашваюцца паняцці, ідэі і абагульненні, заснаваныя на многавяковым сацыяльным і працоўным вопыце. У працах літаратуразнаўцаў (П.Н.Сакулін, В.Б.Шклоўскі) і мастацтвазнаўцаў (І.С.Абрамаў, Н.А.Кожын) падкрэсліваецца, што лубачныя малюнкі могуць быць аднесены не толькі да выяўленчага, але і да славеснага мастацтва. У гісторыка-фальклорных адносінах яны маюць большае значэнне з прычыны таго, што, па-першае, вельмі часта служаць ілюстрацыямі да гатовых літаратурных і фальклорных твораў, і, па-другое, для свайго тлумачэння лубок параджае тэкст-каментарый.

У жорсткіх ідэалагічных умовах 30-х гадоў XX ст. лубачныя малюнкі апынуліся па-за сферай даследчых інтарэсаў, таму што распаўсюджваліся сярод найбольш адсталых сацыяльных слаёў насельніцтва, адлюстроўвалі пераважна забабоны і прымхі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у шэраг шэдэўраў сусветнай лірыкі «малых» формаў і разам з тым меркаваў, што прыпеўка ніколі не з'яўлялася «выразніцай усенароднага ўсведамлення, але толькі індывідуальнага, асаблівага» («Збор прыпевак Кастрамской губерні Нярэхцкага павета», 1909). Мы лічым, што экспромтны, імправізацыйны характар прыпевак моцна перабольшваецца. Як і ў любым лірычным творы, думкі і пачуцці, якія выказаны ў прыпеўках, не маюць працягласці ў часе. Але за перадачай лёгка зменлівых станаў чалавека ў прыпеўках як узорах познетрадыцыйнага фальклору хаваюцца паўасэнсаваныя ўяўленні і схемы паводзін, той «ментальны інструментарый», што выкарыстоўвала асноўная маса людзей на працягу стагоддзяў. Прыпеўкі і лубачныя малюнкі ўспрынялі стэрэатыпныя спосабы бачання і ацэнкі свету, якія з'яўляюцца інерцыйнымі ў параўнанні з пачуццямі, ідэямі і нават каштоўнымі арыентацыямі стваральнікаў літаратурных твораў.

Пры аналізе фальклорнай стэрэатыпіі асэнсавання свету безумоўную цікавасць уяўляе з'ява цыклізацыі прыпевак і лубачных малюнкаў. Як паказаў К.А.Капяржынскі, у прыпевачных «аб'яднаннях» праяўляецца калектыўнае імкненне да агульнасці ідэй і настрояў: «Чым шчыльней аб'ядноўваецца кола выканаўцаў, чым мацней пранікаюцца яны адзіным настроем, адзінай думкай, тым аднастайней становіцца прыпевачны рэпертуар. У выніку вельмі часта імправізуецца даволі цэласны тэматычны і кампазіцыйны цыкл» («Частушачная песня-сказ», 1939, с. 74).

Неабходна распрацаваць адэкватную даследчую методыку «атрымання» з фальклорных тэкстаў і лубачных малюнкаў ментальных установак калектыўнага творцы. Для гэтага ў тэкстах прыпевак трэба, у прыватнасці, «вызваліцца» ад наслаенняў ідэалагічнага і літаратурнага паходжання. Выяўленне ментальнасці дазволіць глыбей ахарактарызаваць сацыякультурнае асяроддзе, у якім ствараліся і выконваліся самыя разнастайныя па тэматыцы прыпеўкі і лубачныя малюнкі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Лубок і прыпеўка ствараюцца для масавага карыстання і страчваюць свой сапраўдны сэнс па-за такім карыстаннем. Яны маюць вялікі творчы патэнцыял і магчымасці актывізацыі гэтага сэнсу, дзякуючы годнасці мастацкай формы і зместу, якія адпавядаюць сутнасным характарыстыкам традыцыйнага мастацтва.

Л.Е.Раманенка,
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

## УНІВЕРСАЛЬНАЕ І НАЦЫЯНАЛЬНАЕ Ў СІСТЭМЕ САМАСТОЙНАЙ ВУЧЭБНА-ТВОРЧАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Маральныя якасці чалавека праяўляюцца ў стаўленні яго да прыроды, грамадства, іншага чалавека, самога сябе. Вопыт жыццядзейнасці даказаў, што толькі гарманічнае існаванне чалавека ў прыродзе і сацыяльнай сферы зможа захаваць яго як від і падняць на больш высокі ўзровень развіцця як асобу.

Нарматыўна-рацыянальны падыход ў арганізацыі адукацыі яшчэ нядаўна дамінаваў у рэспубліцы. У цяперашні час у рэспубліканскую сістэму адукацыі закладваецца сацыяльна-культурны прынцып функцыянавання. Павольна, але грунтоўна ўзрастае цікавасць да нацыянальнай кампаненты, асэнсоўваецца станоўчая і жыццесцвярджальная роля нацыянальнай культуры ў кантэксце сусветнай, вызначаецца яе змест. Змяняецца сама парадыгма адукацыі, а гэта, у сваю чаргу, патрабуе змен у сістэме арганізацыі перадачы культурнага вопыту пакаленняў і падрыхтоўкі педагагічных кадраў.

Безумоўна, змена толькі зместу адукацыі, як паказала шматгадовая практыка, не зможа цалкам задаволіць патрэбы сённяшняга дня. Менавіта фарміраванне прынцыпова новага тыпу педагога-інтэлігента (не па яго

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ